УПРАЎЛЕННЕ ПА АДУКАЦЫІ, СПОРТУ І ТУРЫЗМУ
САЛІГОРСКАГА РАЁННАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА

ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ
“ЦЭНТР ТВОРЧАСЦІ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ САЛІГОРСКАГА РАЁНА”

# З БАБУЛІНАГА КУФЭРКА

### ІНТЭГРАВАНЫЯ ЗАНЯТКІ АБ´ЯДНАННЯ ПА ІНТАРЭСАХ “СПАДЧЫНА” ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ СТАРШАЙ ГРУПЫ (5-6 ГАДОЎ)

Аўтар Таратута Ніна Мікалаеўна,
педагог дадатковай адукацыі

**Адрас: 223710,
Мінская вобласць,
г. Салігорск,
вул. Леніна, д. 57,
тэл. 8 (0174) 225-889**

**Салігорск, 2019**

## З БАБУЛІНАГА КУФЭРКА

### ІНТЭГРАВАНЫЯ ЗАНЯТКІ АБ'ЯДНАННЯ ПА ІНТАРЭСАХ "СПАДЧЫНА" ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ СТАРШАЙ ГРУПЫ (5-6 ГАДОЎ)

**Праграмныя задачы:**

- фарміраваць у дзяцей уяўленне пра жыццё продкаў;
- працягваць знаёміць вучняў з прадметамі побыту продкаў-беларусаў, прыладамі працы, іх заняткамі;
- замацоўваць уменні падбіраць дзеясловы-гукаперайманні, ствараць апісальныя апавяданні;
- узбагачаць актыўны слоўнік дзяцей;
- развіваць пазнавальную актыўнасць;
- выхоўваць патрыятычныя пачуцці і павагу да гісторыі і культуры беларускай дзяржавы, грамадзянскасць.

**Матэрыял**:рэчы побыту беларусаў – льняныя ніткі, печ,ручнік, прас, верацяно, кош, маслабойка, калыска, бусел, прасніца, макацёр, кубелец, ліпаўка, бойка, качалкі, валок.

### Ход заняткаў



**Педагог.** Ой, колькі тут дзетачак.
Як у полі кветачак.
Давайце павітаемся: "Добры дзень!"
І ў словах прывітання
Пажадаць я вам хацела,
Каб ад нашага спаткання
Песня шчыра зазвінела,
Каб не ведалі вы злосці,
Каб жылі ў весялосці.
Таму што вакол нас мноства цудоўных рэчаў, якія дораць нам хараство і прыемны настрой!

**Гульня "Бабуліны загадкі"**

Дзеці сумесна з дарослым разглядаюць рэчы побыту беларусаў, называюць іх. Педагог загадвае загадку, дзеці моўчкі адгадваюць яе, бягуць да адпаведнай рэчы і групуюцца вакол яе, а потым гучна называюць адгадку.

1. Тапілі, білі, мялі, трапалі, рвалі, а потым з іх ткалі (лён, льняныя ніткі).
2. Зімой усё жарэ, а летам спіць; цела цёплае, а крыві няма; сесці на яе сядзеш, а месца не адвядзе (печ).
3. Вісіць, боўтаецца, кожны за яго хапаецца і выціраецца (ручнік, уціральнік).
4. Па возеры шпарка снуе карабель, як пройдзе – пакіне раўнюсенькі след, бо хвалі старанна разгладзіць усе (прас).
5. Чым больш вярчуся, тым больш таўсцею. (верацяно).

6. Ножак ён не мае,
   Ён з адною ручкай,
   А грыбы збірае
   З бабкаю і ўнучкай. (Кош).

**Педагог.** Малайцы. Якую з гэтых рэчаў вы бачылі ў сябе дома ці у вашых бабуль і дзядуль. (Адказы дзяцей).

**Гульня “Хто якія гукі выдае”**
Дзецям прапануюць падабраць дзеясловы-гукаперайманні па ўзоры:
Прас– ш-ш-ш-ш – шыпіць пар
Печ – тр-тр-тр-тр- трашчаць дровы
Маслабойка– з-з-з-з – збіваем масла
Калыска – а-а-а-а – спяваем калыханку
Бусел – клё-клё-клё-клё – клякоча
Прасніца – дж-дж-дж-дж- - гудзіць
Макацёр – цёр-цёр-цёр – працёр

**Фізкультхвілінка**
Гасцёўня, гасціннасць і госці –
У словах ёсць роднае штосьці.
*(Крочаць на месцы ў чаргаванні з падскокамі.)*
Гасцёўня збірае гасцей:
Гасцюйце ў нас як часцей!
*(Прысядаюць некалькі разоў.)*
Гасцёўня гасцямі багата.
Вітаць вас – для нас гэта свята.
*(Нахіляюцца ўперад і назад.)*

**Гульнявое практыкаванне “Знайдзі прызначэнне у сучасны час”**
Педагог расказвае па чарзе пра рэчы побыту нашых продкаў, паказвае іх. Дзеці павінны знайсці карткі гэтых рэчаў у сучасны час.

**Кубелец.** Продкі нашы не мелі заводскіх хладзільнікаў. Сала і мяса круглы год і зімою, і летам, захоўвалі ў кубельцы – своеасаблівым халадзільніку з дрэва. Рабілі яго з дубовых клёпак, радзей – з асінавых ці альховых. Сцягвалі абручамі. Зверху закрывалі вечкам, каб не гаспадарыў у кубельцы кот-памаўза.

**Бойка.** Высокая круглая кадачка, звужаная ўверсе.Рабілі бойку з клёпак. Клёпкі найчасцей стругалі з елкі, гладка апрацоўвалі гэблікам і сцягвалі абручамі. Бойка мела накрыўку з адтулінай пасярэдзіне – для калатоўкі-біла. Да ніжняга канца калатоўкі мацавалася крыжавіна. (Электрамаслабойка).

**Качалкі** – няхітрае прыстасаванне: сама качалка і валок. На качалку – паўмятровую палку-круглячок – накручвалі, скажам, ручнік і раскочвалі валком – драўляным брусам з ручкаю.
**Валок** быў прамы або вогнуты, знізу меў тупаватыя зубцы, нарэзаныя ўпоперак. Гаспадыня прыцiскала валок да качалкі, і валок, хуценька бегаючы туды-сюды, качаў, разгладжваў рэч. (Электрычны прас).

**Гульня "Я назаву, а ты пакажы"**
Дзеці становяцца кругам. Педагог дадатковай адукацыі кажа: "Я мяч кідаю, рэч называю. А ты, злавіўшы мяч, рэч у "Беларускай хатцы" знайдзі і пакажы".



Педагог па чарзе кідае мяч гульцам.
Назвы рэчаў: гаршчок, міска, чыгунчык, чапяла, вілкі, качарга, сявенька, лава, куфар, калыска, ложак.
**Педагог.** Сёння мы з вамі, сябры, папрацавалі ад душы.
На развітанне кажу я вам: "Вы у мяне ўдалыя малайцы!
Хопіць ужо працаваць.
Час прыйшоў адпачываць!"
Да пабачэння!